№2 (33) февраль 2020

# ГРОДНО



## НЕ НОСКИ, А КРЕАТИВ

Топ-5 небанальных идей для подарка на 23 февраля

## КОГДА СЧЁТ ИДЁТ НА МИНУТЫ

Анестезиолог-реаниматолог о том, как взять себя в руки

## ИГРУШКИ НАШЕГО ДЕТСТВА

С чем играли гродненцы в XX веке?

ISSN 2616-8189

Модель: Марта Касперчук, победительница конкурса «Супер Леди – 2019»
Макияж: Наталия Иванова
Причёска: Екатерина Хомко
Фотограф: Алексей Бибиков

За помощь в съёмке и предоставленную амуницию благодарим страйкбольную команду IV Legion

16+



# ЧИТАЙТЕ В НОМЕРЕ:


**10** **Родилась с любовью к книгам**
О том, как прочитать 500 книг за год и найти в них все ответы

**14** **Позитив в подарок любимым**
Чем порадует зрителей филармония?

**17** **Игрушки нашего детства**
С чем играли гродненцы в XX веке?

**21** **На отлично!**
Директор спортивной школы о гимнастике и не только

**24** **Век живи – век учись**
Беседа о жизни и её законах со столетней учительницей истории

**27** **Когда счёт идёт на минуты**
Анестезиолог-реаниматолог о том, как взять себя в руки в непростых ситуациях

**30** **В его руках рождаются караты**
Беседуем с основателем минералогического музея «Карат» Владимиром Жданюком

**34** **Известный актёр Анатолий Котенёв**
о себе, Сергее Гармаше и современной киноиндустрии

**38** **Не носки, а креатив**
Топ-5 небанальных идей для подарка на 23 февраля

**41** **Имя нам – Легион**
О стратегических приёмах и правилах игры в страйкбол

**44** **Пришёл, увидел, остался навсегда**
О выставке американского архитектора, который остался жить в Гродно

**46** **Едзе-едзе вясна...**
Пра тое, як на Гродзеншчыне вясну гукалі

**48** **Под нашей охраной абсолютно всё!**
Узнали, как защитить себя и своих близких от кражи и взлома

**50** **Рисовать – как дышать**
Разговор с художником Юрием Азука о том, как создать сказку и не перестать дышать


Фото Сергея Морозова


Журнал «Гродно» № 2 (33) февраль 2020

**Главный редактор**
Мазайло Сергей Геннадьевич
**Выпускающий редактор**
Анжела Зданович
**Вёрстка:**
Александр Дюрдь
**Учредитель:**
Гродненский городской исполнительный комитет

**Издатель:**
КУП «Телерадиовещательный канал «Гродно Плюс»,
230023, Гродно, ул. Ожешко, 1
grodnoplustv@gmail.com
Тел. +375 (152) 77 33 37.
**Подписной индекс:**
00209 (индивидуальная)
00292 (ведомственная)

**Отпечатано:**
ГОУПП «Гродненская типография»,
г. Гродно, ул. Полиграфистов, 4.
Свидетельство № 1/430 от 24.03.2014 г.,
ЛП № 02330/39 от 27.03.2014 г.

Тираж – 1000 экз.
Заказ № 673.
Подписано в печать 10.02.2020
Формат 60x90 1/8
Усл.-печ. л. – 6,05.

Популярный/рекламный. Издается с сентября 2016 года. Выходит раз в месяц. Издание зарегистрировано в Министерстве информации Республики Беларусь. Свидетельство о государственной регистрации № 1811 от 01.04.2016 г.


Все права защищены. Полное или частичное использование материалов возможно только с письменного разрешения владельцев авторских прав. Мнение авторов может не совпадать с позицией редакции.



# «АЙ, ВЯСНУ-КРАСНУ ЗАГУКАЦЬ»

З далёкай старажытнасці на землях сучаснай Гродзеншчыны гукалі вясну. Яшчэ з дахрысціянскіх часоў сярод простага люду існавала меркаванне, што вясну абавязкова трэба паклікаць, інакш яна не прыйдзе, а зімовы перыяд з маразамі, снегам, завеямі зацягнецца надоўга.

РУСЛАН КАЗЛОЎСКІ
Фота АКСАНЫ МАНЧУК

Даўней новы год пачынаўся з 1 сакавіка (сучасная дата – 14 сакавіка). З гэтага дня і пачыналіся абрады гукання вясны, і доўжыліся яны да тых дзён, калі зямля прагрэецца і аратыя выйдуць на земляробчыя працы ў палі. Ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі вясну пачыналі гукаць на Масленку, а часам і ад Стрэчання, свята дасягала сваёй кульмінацыі на Звеставанне, 7 красавіка, і працягвалася аж но да Вербніцы.

На Стрэчанне (Грамніцы) 15 лютага пачыналі варажыць на поспех у вядзенні гаспадаркі ў вясновы перыяд земляробчага календара. Газета «Віленскі веснік» (1893, № 27) паведамляла: «У Гродзенскай губерні на Грамніцы варожаць аб ураджаі. «Калі на Грамніцы певень нап'ецца вадзіцы, то на Юр'я вол наесца травіцы», г. зн. калі на Грамніцы растане снег, то на Юр'я на лугах будзе ўжо трава».

Вясна ўяўлялася ў выглядзе маладой прыгожай дзяўчыны багіні Лялі, якую можна было ўбачыць на лугах і палетках. Адсюль і паходзіць народны камплімент дзяўчатам «прыгожая як лялька», г.зн. як багіня. Адарваныя ад народнай культуры, недасведчаныя людзі ў XX стагоддзі пераклалі памылкова гэты выраз на «красивая как кукла», які меў пэўны распаўсюд сярод урбанізаванага былога сялянства. У беларускага народа нават існавала асобнае вясновае свята ляльнік у гонар багіні Лялі (Лёлі), дачкі Лады. Праводзілася 5 мая. Вядомы апісанні святкаванняў, зробленыя П.Шпілеўскім (1846) і А.Кіркорам (1882).

Прыгажуню-вясну абавязкова трэба было не проста паклікаць, а выказаць сваю павагу рытуаламі, спевамі, карагодамі і гульнямі. Гуканне вясны супадала з вялікім перадвелікодным хрысціянскім постам, таму ў народнай культуры ў вясновы перыяд шчыльна перапляліся хрысціянскія і народныя абрады і звычаі. Гукаць вясну пачыналі ў нядзелю, калі ўжо з'явіліся першыя пралескі. Загадзя пяклі з цеста «птушак», часцей жаваронкаў, і выносілі ў поле. Паводле народных уяўленняў, птушкі з выраю на сваіх крылах прыносілі цяпло. «Жаваронанчкі, прыляціце, вясну красну прынясіце», – спявалася ў песнях-заклічках. «Птушак» падкідвалі

ўверх, каб хутчэй з'явіліся рэальныя жаваронкі, як вестуны надыходзячай вясны. Знакаміты фальклarыст В.Ліцвінка зазначаў: «З імі (птушкамі з печыва – Р.К.) наладжвалі гульні ў садах, агародах, клалі на галовы і бегалі па вуліцах, прывязвалі да галінак і імітавалі іх прыгатаванне, садзілі на стрэхі, стагі, а потым збіраннем вызывалі іх прылёт, елі, кідалі ў раку, хавалі ў салому, а потым са спевамі звалі іх адтуль...»

Зямлю вясной, паводле тэкстаў песень, трэба адамкнуць, а зіму замкнуць і вясну прыгукаць:

*Благаславі, Божа,*
*Божа мілы,*
*Вясну прыгукаці...*
*А зіму замыкаці.*

Некаторыя абрады ўтрымліваюць элементы калядных. Напрыклад, гурт моладзі са спевамі хадзіў па хатах, гукаў вясну і ў дварах ці каля двароў вадзіў карагоды: «Дзе карагод ходзіць, там жыта родзіць». Падобны тэкст сустракаецца ў абрадзе калядавання: «Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць». Даследчык М.Сысоў зазначаў: «Беларускія абрады гукання вясны вельмі багатыя на шматлікія песні, прыпеўкі, заклінанні, у якіх побач з рытуальнымі матывамі знайшла ўвасабленне тэма любові да роднай зямлі і працоўнай дзейнасці чалавека».

Гукалі вясну з высокіх месцаў: пагоркаў, стрэхаў хат. Нават перагукваліся паміж вёскамі. Дзяўчаты спявалі песні-вяснянкі. Іх асаблівасцю з'яўляецца тое, што кожны «слупок» сканчаецца «Гу!» Найбольш вядомы і пашыраны ў розных мясцовасцях Беларусі варыянт песні заклікае ажно лета:

*Жаваронačкі, прыляціце - гу-у-у-у!*
*Вы нам лецейка прынясіце -*
*гу-у-у-у!*
*А зімачку забярыце - гу-у-у-у!*
*Бо нам зімачка надаела - гу-у-у-у!*
*Усе хлебушкі пераела - гу-у-у-у!*

На пагорках палілі штовечар вогнішчы, вакол якіх вадзілі карагоды і нават скакалі праз агонь як на Купаллі. Спальванне старых рэчаў сімвалізавала развітанне з холадам, амалоджванне навакольнага свету і абуджэнне прыроды вясной. Рытуальнае вогнішча, лічылася, ачышчала зямлю і павінна было паспрыяць разгаранню вясновага сонейка.





*Благаславіце, старыя дзяды,*
*Нам вясну красну выгукаці,*
*Сцюдзёную зіму ў каморачку,*
*А цёплае лета на вулачку.*

Таксама ў мясцовасцях, дзе ёсць рэкі, запаленае кола клалі на плот і пускалі пад выкананне магічна-рытуальных песень па вадзе. На Звеставанне ўжо клікалі буслоў. Паводле народнага меркавання, буслы спрыяюць багатаму ўраджаю зерневых. Вясна ў песнях паказваецца з павагай, як жаданая госця:

*Едзе, едзе вясна*
*На залатым кані,*
*У зялёным саяні...*
*Вязе, вязе вясна,*
*Вязе, вязе красна*
*Ясныя дзянёчкі,*
*Частыя дажджочкі,*
*Зялёныя травы,*
*Красныя цвяточкі...*

Народная мудрасць стварыла шмат цікавых назіранняў, многія з якіх сталі ўстойлівымі выразамі: вясна не мясна, а восень не малочна; багата вясна кветкамі, а лета палеткамі; вясновы дзень год корміць і інш.

Сёння нават цяжка ўявіць, што дзвесце, трыста і болей гадоў таму на месцы шматлікіх мікраранёнаў горада Гродна нашы продкі гукалі вясну... ■